Аб Папе

Аўтар: Рэдакцыя
26.03.2013 01:00



Кс. абп Тадэвуш Кандрусевіч

У касцёльнага карабля з’явіўся мудры і дас-ведчаны капітан, у каманды ёсць адпаведная навіга-цыйная карта – вучэнне Касцёла, і надзейныя маякі – евангельскія запаведзі і хрысціянскія каштоўнасці. Беларускія католікі сваімі малітвамі будуць заўсёды падтрымліваць Вашу Святасць, просячы ў Бога духоўных і фізічных сіл для паспяховага выканання ўскладзенай на Вас вельмі адказнай місіі. Мы таксама молімся з надзеяй аб Вашым пастарскім візіце ў Беларусь, які ўмацуе нас у веры.

†



Кс. бп Аляксандр Кашкевіч

Наш Папа ў сваёй першай прамове звярнуўся да сабраных на плошчы святога Пятра з просьбай аб малітве, падчас чаго запанавала краса-моўнае засяроджанне. Умілаваныя браты і сёстры ў Хрысце Пану, трываем на малітве ў інтэнцыі нашага папы Францішка, які распачынае свой Пантыфікат. Святы Айцец разлічвае на нашу малітоўную падтрымку, каб ён мог плённа выконваць паслугу св. Пятра ў Касцёле – “умацоўваць братоў у веры”. З’яднаемся ўсе ў адной малітве даручэння Пану Богу і Найсвяцейшай Маці Святога Айца Францішка.

Аб Папе

Аўтар: Рэдакцыя
26.03.2013 01:00





